Андрэй Александровіч

Угрунь

1928
Беларускае дзяржаўнае выдавецтва · Менск

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ

УГРУНЬ

ВЫДАНЬНЕ ДРУГОЕ

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК—1928

Заказ № 409. Тыраж 3.000. Галоўлітбел № 1559.

Менск, друк. Профтэхшколы Бел. Дзярж. Выд-ва.

. . . .

Як добра жыць!
Цаглінкаю румянай
Будуем новыя, нязнаныя нам дні...

ВІРАТЛІВЫ РАЗЬБЕГ

НОВЫ ГОД

І з году ў год
і кожны год
крыштальным стыжам
слаўся лёд.

Як з году ў год,
як кожны год,
прышоў на лыжах
Новы Год.

Мінае ноч,
прасьнецца дзень.
За працай, глянеш,—
градам пот.

Было адно,
як млявы цень
ішоў хістаньнем
Новы Год.

Як цень ішоў,
пад лязг зубоў
лілася кроў
над кручаю.

Была журба
і галыцьба
і барацьба
гаручая.

Адно цяпер,
віецца верш,
нібы заранкі
сьмелы ўзьлёт.

Вязе нам песьні
з паднябесься
у зорных санках
Новы Год.

Мо' хто й ня рад —
на новы лад
вядзем мы
дні і ночы.

Ня ў першы год
к нам Новы Год
ідзе
чорнарабочым.

Імчыцца ўгрунь
жыцьця разьбег,
як сьнег
далінай
вольніцай.

Як з году ў год,
як кожны год,
народ
за працай
клоніцца!

31. XII. 26

САСНА

1

Вось адно, як струна,
сасонка расла
у бязьмежным
бары-гушчары.
А сягоньня яна
пачарнеўшы лягла
на асьнежным
фабрычным двары.

Загудзела піла,
застагнала сасна;
пры дарозе,
як сьлёзы, апілкі.
Сасонка расла,
як струна,
не адна—
з ёй і сёстры, як тыя асілкі.

Расла маладзіцай,
вяршынаю сьмела
зьвінела
і ў сьцюжу-завею.

Бывала імчыцца
вей-вецер
і вецьце
лёгкім напевам авее...

І птушкі-вясьнянкі
сасонцы
да сонца
зайграюць на гусьлях зялёных...
Цяпер, як скала,
скамянеўшы лягла,
закрыўшы галінкамі скроні.

2

Эх, сасоньніца-сасна,—
дні суровыя...
Бервяно да бервяна—
хата новая.
Дый спрадвечная дрыгва,
нібы раніца,
Буйным цьветам хараства
зарумяніцца.
Гаратлівасьці былой
час пазбыцца нам.
Забудуем шыр балот
камяніцамі.
Эх, сасоньніца-сасна,—
дні суровыя...
Бервяно да бервяна—
хата новая.

3

Цяжкая праца, нялёгкая праца,
цяжка, браты, беднаце будавацца.
Капейку, другую за працай зьбярэм мы,
злыдзень эмарнуе,—зьбіралі дарэмна.
Шмат каму нашае сёньня варожа
гатовы атрутай,
— чорнай пакутай,
— чорнай пакутай
стрыножыць!

Чэшуцца рукі спрадвечных зладзеяў,
рвуцца стрыножыць, дый сіл не стае ім!
Корчыцца помста ў іх сэрцы
здрантвелым...
А глянеш наўкола—будуюцца сьмела!
Праца віхрыста ўзьняла завіруху—
і хочаш ня хочаш:
— а песьню рабочых,
песьню рабочых
— слухай:

4

Гэй-жа, разам!
Гэй-жа, разам!
Гэй, адразу
возьмем
разам!
Гуртам!
Дружна!

— Хлопцы, эдужым!
Гэй, яшчэ!
яшчэ!
яшчэ!
Будзе сонца
зьзяць ярчэй.
Што ня стане
ў час рабочы?
Ў нас і камень
зарагоча!
Гэй!
Адважна!
Ўсё для нас!
Дай, наляжам,
друж-на!
... Раз!

5

Эх, сасосьніца-сасна,—
нашы дні суровыя.
Бервяно да бервяна,—
хата новая.
Дзе-ж раскінута багна—
вырастуць дуброваю:
за сасонкаю сасна—
сосны новыя!

1926 г.

ВАРТАЎНІК

1

Ночанька цёмная голаву зьвесіла.
— Сумны ты, дружа?
Знаю, ня весела.

2

Шорах пачуецца, постаць находзе,
думка адна: бязумоўна, злодзей.
Хто-ж яго ведае, хто разгадае?
Кажуць, што ночанька гора стварае.
Крамы жалезныя. Сэрца слабое.
Страх неразлучны з праклятаю цьмою.

3

Часта ўначы валацугі праходзяць,
ведаеш, дружа, ня кожны з іх злодзей.
Часам бывае падыйдзе каторы,
дасьць закурыць, ад душы пагаворыць,
сядзе ля крамы, такі ўжо ў іх звычай,—
сьмела, ня бойся ты іх, вартаўнічы.

4

Глуха на вуліцы. Скованы камень.
Зьзяе ліхтар, нібы зорка ў тумане.
Гутарка з стрэхамі, страшна парою
цемень заводзіць сыпучай імглою.
Холадна. Жудасна. Ногі слабеюць.
Сэрца ў трывозе начной ледзянее.

5

Знаю, ня весела. Ночка цягучая
цемрай васеньняю так надакучыла!

. . . .

... Але як дворнік старэнькі устане—
думкі ўзьвіюцца,—радасьць сьвітаньня.

15. X. 26

ГАЗЭТЧЫК

Ад самай раніцы, застыўшы ўвесь ад сьцюжы,
стаіць з газэтамі ля крамы на рагу.
Па бруку носіцца, мяцеліцаю кружыць
грукат гораду, звычайны грукат-гул...

Вецер і мароз—ну проста дух займаюць,
а ён крычыць, схапіўшы бляск навін:
— Чан Кай-шы—нам здрадзіў у Кітаі.
— Кат Пілсудзкі топіцца ў крыві.

— Троцкі з Сталіным ня хоча пагадзіцца...
— Ў Менску хутка ўжо залязгае трамвай!
І так ад раніцы навіны б'юць крыніцай,
І так за дзень—рубель, а можа два...

Над белым горадам зазьзяюць ясна зоркі,
на вуліцах дрыжыць вітрын электра-сьвет...
З „апошніх вестак“ скруціць ён махоркі
— і дамоў з астаткамі газэт.

На печцы цёплай ён журналы разглядае,
у вочы сонныя залазіць чорны дым—

і скроні мёрзлыя спакойна зачыняе:
заўецца сон вяночкам залатым.

А раніцаю зноў—няхай мароз, завея,
няхай трашчыць старая галава—
у горад сунецца, і сэрца ледзянее,
і зноў за дзень—рубель, а можа два...

Г У Д К І

Малодшым маім таварышам — дзецям працоўных Савецкай і Заходняй Беларусі —
прысьвячаю.

1

Як толькі ноч суровая
за набасхіл зьбяжыць,
зарніца каляровая
над краем задрыжыць.
Устануць і зьбіраюцца
на поле мужыкі,
а ў горадзе ўзьвіваюцца—
гудкі... гудкі...

2

Рабочыя адважныя
на фабрыку ідуць—
хутчэй пазбыць сярмяжную
нам спадчыну бяду.

У вёску з самажнейкамі
імчацца цягнікі.
Пачуюцца з жалейкамі—
гудкі... гудкі...

3

Як глянеш, сэрца радуе:
будуем новы лад.
У кожнай хаце радыё
і радасьць зацьвіла.
Была дрыгва далінаю
праз цэлыя вякі,—
цяпер гудуць машынныя—
гудкі... гудкі...

4

А сонца шле праменьні нам,
вось быццам на папас.
Мы помнім, помнім—Леніна
ня стала сярод нас.
І змоўклі над краінаю
сякеры, малаткі:
заплакалі хвілінаю—
гудкі... гудкі...

5

З песьнямі агністымі
і крэпнем і расьцём.

Мы будзем комуністымі—
на зьмену мы ідвём.
Мы будзем абаронаю,
мы ўсе—франтавікі,
хай клічуць нас чырвоныя—
гудкі... гудкі...

ВЯНОК

Сумны сёньня дом дзіцячы,
ня зьвініць крылаты!
І вось вецер быццам плача—
скрыўджаны утратай.

* * *

Бяспрытульная дзяўчынка
згінула—змарнела.
Хлеба чорнага скарынку
тыднямі ня мела.

Што-ж рабіць? Каму схіліцца?
Дзе знайсьці збавеньне?
Сохне твар, як жоўталісьце,
сохне ў сутарэньні.

На работу дзе наняцца,
дый гадкоў-жа восем.
Хто там дасьць якую працу,
дый каго папросіш?

Цяжка, цяжка і сьцюдзёна
і няма прыпынку:

ні матулі, ні знаёмых,—
бедная дзяўчынка.

Горам лютым ветры выюць,
асушаюць сьлёзы.
Сэрца плача. Грудзі ныюць,
Страх нясуць марозы.

Як заўсёды, ой, бадай іх,
дні бядой ляцелі
і, як баецца у байцы,
сірату сустрэлі.

У прытулак наш забралі,
і лягчэй ёй стала.
Але вуліца бяз жалю
сілу падарвала.

Шанавалі—даглядалі
любую сястрыцу.
Ўвечар песьні ёй сьпявалі,
толькі-б ня журыцца.

Толькі-б вось каб сум закінуць
і ня ўспомніць гора.
Зьвіць дзяўчынцы-сіроцінцы
радасьць з ясных зорак.

Але сёньня цёмнай ноччу
сэрца замаўчала
і жыцьцё, як той лісточак,
з дрэва адарвала.

Над пагорбленай царквою
завывае вецер.
Апавітае імглою
зашумела вецьце.

Сумна-сумна над курганам
ставяць дамавіну.
Сэрца жудасьцю нязнанай
рвецца ў сьвет—даліну.

А наўкол крыжы, магілы,
помнікі, капліцы.
Ой, шкада дзяўчынкі мілай,
Ой, шкада сястрыцы.

Ня сьціхае шум зялёны,
жаласьліва-хмурны;
ў гэтым шуме засмучоным,
быццам звон хаўтурны.

Захісталіся бярозы,
як сіроты плачуць,
нібы сьвечы пры дарозе,
сьвечы, няіначай.

Разьвітаньнем дзеці-дружкі
боль ў вянок зьвівалі,—
напісалі на істужцы:
— Сіроцінцы Галі.

12. IX. 26 г.

КРЫЎДА

Акадэмічнай канфэрэнцыі па пытаньню рэформы беларускага правапісу і азбукі —
прысьвячаю.

Няхай імгла,
няхай імклівіць восень,
няхай вятры акутваюць выцьцём.
О, дні крылатыя!
Нікога мы ня просім
звеяць радасьцю юнацкае жыцьцё!

Паклоны біць?
— Вясьне вясёлка-тканай,
дый пералівам сонечных крыніц.
Як добра жыць!
Цаглінкаю румянай
будуеш новыя, нязнаныя нам дні.

Пяшчоты радасьці
вірліва-творчай працы,
як песьня звонкая,

як прозалаць—агонь,
агорнуць ласкава
і нават дзіўна, братцы,
ня чуе змориасьці юнацкая далонь.

Бывае ўсё-ж
і сумна часам стане,
крыўдай лёгка сэрца разгнявіць.
Ёсьць-жа людзі з доўгімі вушамі,
але ці варта толькі гаварыць.

Няхай туга
зьвіе цябе часамі
у вечар восені, у вечар мітульгі,
тады прыпомніцца
і жудасна мне стане,
— сьвет забыты, сьвет другі.

А сёньня—мо' таму, што восень
сьцюдзёным сьвістам
ладзіць свой звычай—
крыўду горкую успомніць давялося!
—А як забыць?
Люблю-ж я родны край!

І слова мне
так дарага і блізка;
ў сугуччы гордых слоў
крыляцца дні цяпер!
Сабраліся...
Няма гаручай іскры!
Гатовы выкрасьліць любімае мне „р“.

А хто адважыцца
поэму дзён бурлівых
бяз „р“—
сьлюнявасьцю лірычнай апяваць?
Забыліся!
Забыліся на дзіва...
Ну, што-ж!
Як сьцелецца,
дык так і будзе спаць!
Адно, што сэрца радуе бязьмежна:
вечны гоман вуліц гарадзкіх,
як зоркі ясныя,
як месяц беласьнежны,
як шэлест працы моцнае рукі.
Няхай імгла,
няхай імклівіць восень,
няхай вятры раскідваюць выцьцё.
О, дні крылатыя!
Нікога мы ня просім
авеяць радасьцю юнацкае жыцьцё.

Сьнежань 1926 г.

МІНІСТР

О, Бэрлін! Вялікі горад!
Прывітаньне! Guten tag!
Над асфальтавым пpастоpам,
як і ў нас, крыляцца зоры —
ды інакшы толькі сьцяг.

Два жыцьці... На Фрыдрыхштрассэ—
неўтамонны п'яны шквал.
За рэклямнаю прыкрасай,
гордай сілай, эмрочным часам
завадзкі стаіць квартал.

Там бяда гасьцём звычайным
і на скронях кроплі сьлёз.
Там... сягоньня, хоць патайна,
творацъ злучана, адчайна
для краіны лепшы лёс.

Белай плыньню хвалі Рэйна
б'юцца злосна ў берагі.
Энгельс, Маркс, Ласаль і Гэйне
чулі ў хвалях веснавейных
гоман родны, дарагі.

А ў піўных пяюць цыгане,
звон бакалаў, пляска, сьвіст.
У кутку сядзіць, як глянеш,
бяспрытульны віленчанін—
бэ-эн-эраўскі міністр.

Грудзі ныюць, высыхаюць,
за душою ні рубля.
Па далёкім родным краі
сум агортвае-зьвівае,—
як-ні-як—свая зямля.

Там Дзьвіна і слаўны Нёман
даражэй, чым горад Рэйн.
Там пачуеш звонкі гоман,
там і Віцебск, там і Гомель...
Эх, хутчэй-бы, эх хутчэй!

І у думках ён імчыцца
праз фокстроты і джаз-банд...
— Вось у Менску, у сталіцы,
правіць роднаю зямліцай—
і зганяе прэч туман.

Думкі зьніклі... Рэкашэтам
злосьць кідала яго ў жар.
Беларусь над цэлым сьветам,
як Расія—край Саветаў
і абраны камісар...

Дні плылі... Міналі годы...
Зьмен віхрыстых ён чакаў.

Ня ўсьміхнулася пагода,
беларускаму народу
ліст раскаяньня прыслаў:

...„Думаў так, а вышла гэтак;
рвуцца ў даль за годам год.
Ў Беларусі ўсё саветы,
шлях аздобіў агняцьветам
шматпакутны наш народ.

О, прымі мяне, як сына,
шчыры шлю табе паклон.
Разам зробім для краіны,—
зробім—лепшыя хвіліны,
стрэнем радасьць новых дзён“.

І задумаўся, а сьцюжай
камянела ў жылах кроў...
Калі ехаць—значыць дружна,
працаваць, як сьлед, напружна,
бо... змагу вярнуцца зноў.

І сабраўся наш народзе—
і рабочы і мужык—
і ўхвалілі: хай прыходзе
бо, як кажуць, не зашкодзе
ў кожнай хаце лішні цьвік...

ФАБРЫКА СЬМЕРЦІ

Краіна родная! Дарогі крыжавыя!
Скажэце гоманам нахмураных прысад:
— Глумілі нас фэльдфэбелі Расіі,
як быццам поле ў буру буйны град.

Дарыла торбы нам, жабрачыя дарыла
„культура“ чорная разьюшаных баяр.
На струны з нас зьдзіралі нашы жылы,
смакталі кроў памешчык і жандар.

Сьвету яснага ня бачыў край вякамі,
грудзі кволыя сьціскаў халодны мур.
Слова роднае закоўвалася ў камень,
народ наш знаў: турму і сьмертны шнур.

Прайшлі гады... Народ з няволі выйшаў.
Жыцьцё інакшае спаткала Беларусь.
Але мы помнім, помнім на Лукішках
быў павешаны адважны наш Кастусь.

І сёньня... там... у загранічных ботах
жандары-найміты крывавую разьнёй
нашых змучаных братоў за польскі
„злоты“
зьвярына катуюць, накінуўшысь грунём.

Зарасьлі былі сьляды баяр праклятых,
загінуў бляск фэльдфэбельскіх пагон.
А сёньня... там... будуюць казематы!
А сёньня... там... няведамы прыгон!

Па сьпінах мужыкоў ангельскі сьвішча
шомпал,
гуляе паншчына—нікчэмны чорнацьвет.
Чаго-ж маўчыць культурная Эўропа?
Крык зьняволеных даносіцца ў сусьвет!

Зноў Лукіскіх камер не хапае,
зноў шляхі афарбавала кроў...
Што-ж паноў разьюшаных стрымае?
Правіць турмамі Пілсудзкі-Мураўёў!

Але шляхі адважнага змаганьня
ня змые паншчына кіпучаю крывёй.
Надыйдзе новае, агністае сьвітаньне
Сярпа і Молата над злучанай зямлёй.

... Краіна родная! Дарогі крыжавыя!
Гудзеце гоманам нахмураных прысад:
— Польшча сёньня, як царская Расія—
краіна сьмерці!.. Краіна цёмных крат!..

БЕЛАРУСКАЯ МАРСЭЛЬЕЗА

На процэсе Беларускай Сялянска-Рабочай Грамады ў Вільні абаронца Сьмяркоўскі, руйнуючы тэзісы пракуратуры аб змове, якая нібы-та была ў грамадаўцаў, сказаў:

— „Магчыма, змова была ў тым, што сьпявалі беларускі гімн. Пракуроры кажуць, што ў гэтым гімне ёсьць вострыя і цьвёрдыя словы“.

(„Савецкая Беларусь“, 13/V 28 г.)

Сілу забраўшы, параніўшы грудзі,
родную мову імкнуцца забраць.
— „Сьмяюцца над намі багатыя людзі,
здаецца, панамі іх зваць“.

Сьмяюцца—загнаўшы працоўных за краты,
сьмяюцца—да сьлёз над бядой галыцьбы.
Знаем мы—бліяцца штурмы й расплата,
віхры ліхой барацьбы!

— „Што трэба свабоды, зямлі чалавеку“,
чуеш, гучыць над зямлёю, як гром?
Досыць! Даволі! Мы спалі адвеку...
Запалім-жа сэрца агнём!

Бяз хлеба, бяз грошай, нібы ў бездарожжы,
усюды ганяюць, сьмяюцца і кпяць.
— „Мы доўга цярпелі, цярпець больш ня
можам,
дык пойдзем мы долі шукаць“.

Дык пойдзем, здабудзем агнём і мячамі...
Гэй, Беларусь, мы здабудзем, гэй!
— „Хай нас сустрэнуць палямі, лясамі
Грамады працоўных людзей“.

Час той настане, адкінем абрэзы
і судзьдзямі будзем, ня шляхта, а мы.
І родныя словы сваёй марсэльезы
з гордасьцю выйдуць з турмы!

ПАНСКІ ПАДАРУНАК

(Да прысуду над „Грамадой")

І ляціць бязьмежжам
вецер, як на крыльлях.
— Межы, толькі межы
радасьць засланілі.

*

Там забралі права
думаць, толькі думаць!
Чорная расправа—
панскі падарунак.

*

З панскага абліччу
дай сарвем завесу,—
колькі там налічым
жудасных працэсаў!

*

Чую крык нястрымны
полем і лясамі:
лепшы сын краіны
сёньня катаржанін.

*

Ляскаюць кайданы,—
ў катаргу магнаты
люд закатаваны
гоняць з казематаў.

*

Знаем мы, ў палацах
крыецца яднальне—
майстраў правакацый,
лютасьці й выгнаньня.

*

Толькі дзеці працы
Сёл, мястэчак, местаў
сілай дэманстрацый
шлюць свае протэсты.

*

Хай гучыць нястрымна
глеба пад нагамі:
лепшы сын краіны
сёньня катаржанін.

*

Хай разьлёгся вужам
дрот, радзіўшы стогны.
Але не! Ня здужаць
Беларусь мільёнаў!

*

Чую я заўсёды,
чую й ня дзіўлюся—
ўзойдзе й там пагода
Савецкай Беларусі!..

ТАВАРЫШЫ, З НАМІ ВЯСНА

Стройся калёнай, жалезная сіла,
чуеш фабрычны гудок?
— З намі вясна! Уздымам шматкрылым
сэрца гаручае запаланіла,
як-бы электрычны ток.
З намі вясна! Таварышы, з намі!
Рукі прасьцерла праменьнем жыцьця.
Сонцам шматструнным,
маёвым сьвітаньнем
зьвіла пераможны Чырвоны сьцяг.

Колькі запалу, адвагі і веры
крыецца ў сіле рабочых калён.
Валамі шторму
рушацца ўперад,
на штурм заклікае
змаганьня закон.
Бяз страху —
жыцьцё аддавалі на плаху.
Бяз страху, бяз жалю
змаганьне вялі.

Ворагаў білі размахам
напорным,
шляхам
прасторным
наперад ішлі.

Славу здабытую дзён пераможных
стальлю гартуе фабрычны варстат.
А думкі крыляцца, імкнуцца трывожна
ў краіну, дзе давяць адценьнямі крат.
Ў краіну разьюшанай банды магнатаў,
дзе прагнуць, каб зьнішчыць, бясьсьледна, на
звод
прадажныя людзі: жандар, провокатар—
на суд вядучы беларускі народ!

Таварышы, гэй!
Народ беларускі!
Хай разгараецца прозалаць зор.
Гнеў чалавека, напружыўшы мускул,
судзьдзям напіша агнём прыгавор.
Магнаты, баяры, усе—
бязумоўна
гнуцца ў паклон залатому рублю.
Рвуць скарыстаць, каб суцішыць працоўных—
аэро, гідро—
ваду і зямлю.

І вырваць мову!
І вырваць рукі—

Хто,
якой сілай
країну сагне?
— Дый не!
ніколі!
адны пагудкі.
Ня вырваць мову!
Ніколі! Не!
Таварышы, гэй! Заўсёды адважна—
каб толькі...
бяз панікі, ўперад—угрунь!
На полі, на бруку
загінем, паляжам,
адно ўсё-ж запалім
ў відалях
зару.

Думкі, як іскры, ружовым сьвітаньнем,
думкі, як іскры, асьвечваюць шлях.
— З намі вясна!
— Таварышы, з намі!
— Трымайце горда
Чырвоны сьцяг!

ПАДАРОЖЖА

> ... І ў горад замызганы ў прочкі
> пайшоў я з бярозавым кіем...
> ... Сабака правёў да прысадаў
> і назад невясёла памуляў...
>
> *Язэп Пушча*

Раніцай—рана,
чуць сьвет зарою
зальле пазалотаю нашу зямлю,—
пайду ў Падарожжа, пайду далінаю,
маладасьць ветла прасторам схілю.

Сінім туманам,
расою сасновай
вочы прамыю, песьню гукну!
Разам з заросшай зялёнай дубровай
шэлестам лісьцяў сябе апрану.

Пайду праз балоты...
Гэй, гэй, дрыгвою!
Сустрэну я вербаў раскіданы шум.
Ці простаю сьцежкай іду ці крывою—
радасьць у сэрцы сваім нашу.

Вышаў я ў сьвет...
Дарога цяжкая...
Імкненьне—адно што ўцяшае, заве.
Дарогай сялянку за працай спаткаў я.
Ўсьміхнуўся ў вачох яе вольны сусьвет...

Імкненьні юнацтва...
Гэй, гэй, Падарожжа,
вечнае сонца, радасны кліч!
Наша жыцьцё навальніца ня зможа
ў родных прасторах бязьмежнай зямлі.

Няхай сутарэньне
мяне прабачае,
пайду па шляхох беларускіх далін.
Пайду я па вёсках, бо іх пакідаюць,
ня вывеўшы ў полі заросшы палын.

У горад ідуць...
Да прысадаў сабака,
шавелячы хвост, прабяжыць усьлед.
Іх ня прывабіла сілай ніякай
хата-чытальня, ячэйка, савет...

З жыцьцём нясуладзіўшы,
як на чужыне,
пакінуўшы вёску, сьціраюць асфальт.
Любоў да жыцьця
няпрыкметна ў іх стыне,
ня вабіць іх заўтрага сьветлая даль.

А горад бязьлітасны,
горад бурлівы,
— зьнямог,—
ён ня спыніць крылаты свой бег!
... Бяспрытульнымі
песьнямі выюць нудліва,
праз сьлёзы ўзьнімаюць асінавы сьмех.

Ім не ўдалося
з горадам зжыцца,
дзіка ім песьня сталёвых машын
Горад іх давіць, як пылам кастрыца,
як вёску іх родную горкі палын.

Кожнае слова іх
смутак зьвівае,
быццам бясьсільлем хварэе ўдава.
Эх, Беларусь ты мая, залатая
згіне дарма не адна галава!
Няўжо гэтак цяжка
на новай пуціне
радасьцю ўсеяць дзянёчкі свае?
Няўжо праглыне іх карчмы багавіньне,
дый сум замагільны на век абвіе?..

Пайду я прасторам
лясной Беларусі,
пайду па шляхох беларускіх далін.
Горад, мой родны, я не зракуся
Гучных мэлёдый сталёвых машын.

Толькі прайду я
далінай вазёраў,
там—пакарчуем палын-траву.
Зноў я вярнуся, вярнуся ў свой горад
і пакланюся яго хараству...

Полацак, 1926 г.

* * *

І сонца, як сонца,
і дзень, як дзень,
ідзеш каля брамы—
на браме цень.

Дзесятая восень
з пагардай прышла.
А вецер, як вецер,
імгла, як імгла.

Вось толькі ў грудзёх,
вось у сэрцы адным—
шчасьце віецца
пярсьцёнкам, як дым.

Шчасьце вялікае,
радасны ўздым—
з гораду ў горад
нясуць гарады.

Гмахі ўзрасьлі,
дзе трухнела дрыгва.
О, слаўлю цябе я,
зямля характва!..

Лістапад 1927 г.

ВІРАТЛІВЫ РАЗЬБЕГ

1

Бадзёрыя дні!
Сонцатканыя словы,
як хваля, шумліва
ўзьвіваецца верш.

Сьцежкаю вовaю,
працай вірлівай
нязнаныя дні
спатыкаем цяпер.

Шчасьцем агністым,
вясьняна-бурлістым
думкі крыляцца віхрыста
угрунь.

Радасьцю сьветлай,
як сэрца поэта,
цьвіце залацістa
мая Беларусь!

2

— Чаму? Я ня знаю,
як ветліва гляне
сонейка тканае
ў вей-харастве.

Я ўспамінаю:
песьню й паданьне,
возера й замак,—
былы чорнацьвет.

Гнулі, ой, гнулі
народную сілу
няволяй паганай
да жвіру-зямлі.

Прайшло! Праміпула!
Жыцьцё ўскаласіла
зернем румяным
прывольных хвілін.

І лютая сьцюжа,
і вецер расхрыстань,
ніколі ня здужаюць
сілы віхрыстай.

Словам мужычым,
як радасьць, свабодным,
словам гаручым,
як прозалаць зор,
дні акрынічым

крыніцаю роднай,
прымусім сугуччам
разьліцца прастор.

3

Часта ў над вечар.
вось быццам, як звычай,
думцы схілюся,
цалую жыцьцё.

І чую, як шэпча
пасёлак фабрычны:
— Для Беларусі
расьцём, расьцём.

Расьцём для краіны
такой невялікай,
якой мы павінны
ў лагчынах балот

заўтрае клікаць
сталёвай машынай,
узьняўшы няўпынны
дзён сьветлых узьлёт.

Ці-ж мы, маладыя,
ня любім даліну
муроў камяністых,
як гордых скал?

Дні залатыя
авеяць павінны
песьняй віхрастай
фабрычны квартал!

У шэрым завулку
разносіцца гулка
і ў цёмныя ночы,
і ў сонечны дзень

скрогат суровы
машыны сталёвай,
як песьня рабочых
агнём з грудзей.

Бывае нявесела
стане часамі,
гул праглыне,
як увосень багна.

Голаву зьвесіць
(бо сэрца ня камень),
а працы ня кіне
рабочы юнак.

— Таварыш, даволі!
Змарыліся рукі!
Хвіліну, чакай,
Не астынуць агні!

Хай сьцішыцца грукат,
як вецер у полі,

машыну стрымай,
— адпачні!

Машына—ня грудзі,—
ня зморыцца ў працы,
колы—ня рукі,—
ня будуць слабець.

Вечнасьцю будзе
пераліваццa
гоманам гулкім
машыны разьбег.

Юнацкія сілы,
ой, лёгка патраціць.
Бяз сонца, цягуча
прасунуцца дні.

А трэба, мой браце,
каб нас атуліла
каханьнем гаручым
барвовасьць зарніц.

4

Часта ў над вечар,
вось быццам, як звычай,
зоранькам шустрым
схіляю паклон.

Сэрца мне шэпча,
таемна ў надзвычай,—
выйдзем насустрач
вялікіх дзён.

Выйдзем, няйначай
як з песьняй прывольнай,
дружнай грамадай
ў бязьмежжа зямлі.

Многа патрачана,
знойдзена болей.
Знойдзена радасьць
нязнаных хвілін.

5

О, воля юнацтва—
пара захапленьняў!
Адвага! Бадзёрасьць!
Вірлівая кроў!

Віюцца за працай
мае лятуценьні,
як чайка над морам,
як сьмелы арол.

Думанькі рвуцца,
віюцца вяночкам,
часамі бурліва
ўзьнімаюць мяцеж.

Як быццам лісточкі
вясною віюцца,
юнацтвам шчасьлівым
зьвіваючы верш.

Сьнежань 1926 г.

. . . .
Што нашу моладасьць
зможа стрымаць?..

МОЛАДАСЬЦЬ І СОНЦА

СТРУНА

Крані струну ў грудзёх сваіх,
струна шматзвонная зайграе,
зазвоніць песьня залатая—
крані струну у грудзёх сваіх.
Крыляцца думкі, як страі,
і ціха шэпчуць па-над краем:
крані струну ў грудзёх сваіх,
струна шматзвонная зайграе.

ПРАСТОР КАЗАЦКАЙ КОНЬНІЦЫ

Сонца
у дзіўных скалах
славу нам снавала.

Арол
на небасхіле
ў праменьнях грэе крыльля.

Горы,
шлях арліны,
цалуюць сінь вяршынай.

Даліны
ветравольніцы
прастор казацкай коньніцы.

* * *

Я схіліў чупрыну,
ўзышоўшы на скалу:
горам і далінам,
сонцу і арлу.

1926 г. Каўказ.

ШТОРМ

Што шуміш так, мора,
гулам нясьціханым,
гулам хвалі чорнай,
хвалі раззлаванай?

Чуць відно, далёка,
там, на небасхіле—
парус адзінокі
ў хвалях абясьсілеў.

Дый вятры ганяюць...
Жудасна ў палоне.
Белай пенай грае
страшнае прадоньне.

Кончыцца бядою,
толькі так, няйначай.
Абвіе журбою
вецер кут рыбачы.

А каму па сілах
дужацца са штормам?
Вецер над магілай
хваляю прыгорне.

Шумна чайкі строем
спуджана крыляцца:
сьмерць не за гарою,
страшна агглядацца!

І гудзіць-жа мора
гулам нясьціханым,
гулам хвалі чорнай,
хвалі раззлаванай.

Жыў рыбак на сьвеце,—
рыбака ня стала.
Гоніць злосны вецер
шквалам вал за валам.

Сімеіз, ліпень, 1927 г.

МЯЦЕЛІЦА

Мяцеліца. Сьцюжа.
Сьняжынкі кружаць...
Вецер галосіць,
разносіць
бель.
Сьцюжа,
мяцеліца
сьцелецца,
кружыць
гульліва,
жартліва,
нібы карусель.

* * *

Што нам мяцеліца?
Што завіруха?
Што нашу моладасьць
зможа стрымаць?
Сьнег весяліцца
ліхой пацярухай?
Няхай весяліцца—
на тое—зіма!
Люблю, калі санкі

завулкамі носяць,
дый звонкія бомы
стрыножваюць сон.
Песьняй люблю я
у сьвята прыносіць
у хату рабочага
нізкі паклон.
Люблю я на лыжах
асьнежнай далінай
імчацца ў прастор
срэбрашумных завей.
Што маладому
ў прывольнай краіне
як радасьць жыцьця—
даражэй?

* * *

Думанькі сьветлыя
ўсьмешкаю ветлаю
вейна віюцца,
ткуць радасьці ўзор.
Сьцюжа,
мяцеліца
сьцелецца,
кружыць.
Звонам
сьцюдзёным
вітаюць прастор...

1926 г., XII.

ВЯСНА ІДЗЕ...

Дзень чаканы,
　　дзень румяны,
　　дзень праменных струн,
дзень вясеньніх
　　лятуценьняў
　　к нам імчыцца ўгрунь!

На спатканьне
　　звонкім раньнем
　　выйду ў сьвет-прастор.
Гляну, гляну—
　　дзень вясьняны
　　выплыве з-за гор.
Пры дарозе
　　тры бярозы,
　　тры бярозы ў рад
Дзень вясновы
　　шчырым словам
　　клічуць на пасад.
Цёмнасіняй
　　злоснай плыньню
　　мчыцца-равецца лёд.

Сонца спаліць
      і бяз жалю
      срэбраны сумёт.

Дзень вясеньніх
      лятуценьняў
      к нам імчыцца ўгрунь!
Выйду, гляну:
      дзень жаданы,
      дзень праменных струн...

5. IV. 27 г.

ВОЗЕРА

Ціхай гутаркай возера шэпча ў бары,
гнуцца сосны ад буйнага ветру.
Сонца гасіць ліхтар свой на скалах гары
і зьнікае ў няведамай нетры.

Ветрык змоўк... Цішыня... Веснавейны змрок.
Рдзее прозалаць зорак яскравых.
Пахмурнелі кусты, не шасьцяць і лісты,
толькі чуюцца песні-праявы.

Пакорная ночанька звонкай вясьне
шалясьценьнямі славу зьвівае.
Месячык выплыў у срэбным чаўне—
баравое жыцьцё аглядае...

ЗОРКА

Зорка, ой, зоранька
ветла міргае.
Хуценька-скоранька
рань заіграе.

Гулкі фабрычны
гудок пранясецца,
сілай крынічнай
работа пальлецца.

Літара к літары—
гучнае слова.
Радасьцю зьвітае,
радасьцю новай.

Працай, як сонцам,
засьвеціць яскрава
роднай старонцы
багатая слава.

Цёмная зоранька
ціха зьнікае.
Хуценька-скоранька
рань заіграе.

1926 г.

ШАЛЯСЬЦЕНЬНЕ НЯЗНАНЫХ ПЯШЧОТ...

Бэці

I

Сустрэліся ў вечар, авеяны
шалясьценьне нязнаных пяшчот.
    Штосьці сэрца маё паланее,
    нібы ўзбурана крыкам няўзгод.

Я ня знаю, аднойчы казалі,
што каханьне ўсё роўна, як дым,—
узьвіецца пярсьцёнкамі ў далях,
ну і зараз-жа гінуць сьляды.

Я ня знаю, а мне вось даволі,
а што блізіцца, што да таго?
Буду сэрцам гульліва сваволіць,
пакуль не астыне агонь.

Больш ня будзе, чым быць павінна.
Эх, моладасьць, нібы стацьцё
цёмназорыя вочы дзяўчыны
і мне завязалі жыцьцё.

II

Сустрэліся ў вечар, авеяны
шалясьценьнем нязнаных пяшчот.
 Неба цёмнае зоркамі ўсеена—
 значыць пройдзе вясёласьцю год.

Так, здаецца, у нас варажылі
ў навагоднюю ночку калісь;
і ўзьвіваліся радасьці крыльля
ў задуменную зорную высь.

А ўсё роўна, ці зоркі мігаюць,
ці сьлязьлівыя хмары ляглі.
З нас ніхто і ня знаў і ня знае,
як жыцьцё варажбой атуліць.

Дык ці ростань стаіць перад намі,
каб аддацца ліхой варажбе?
Нашы дні—не маўклівы камень,
а шчасьлівы юнацкі разьбег!

III

Румянцам зара па-над садам
заіграла, як твар юнака.
Я сустрэў цёмназорую радасьць,
цёмназорую радасьць спаткаў.

Дык чаго маладому журыцца,
разьлівацца мілоснай сьлязой?
Ці-ж ня лепш узьвівацца крыніцай—
гучных песень вясны залатой?

А вось глянеш, усхліпваюць людзі,
і сьлюнявяць вірлівыя дні.
Так бывае, калі хто заблудзіць
далінай жыцьцявейных зарніц.

Можа ў старасьці й мне сумна стане,
а сёньня чаго сумаваць?
Забыцьцём атуляе каханьне,
рассыпаючы хмель хараства.

IV

Сустрэліся ў вечар, авеяны
шалясьценьнем нязнаных пяшчот.
        Ня прышоў-бы, падумала: дзе ён?
        З сэрца вырваўся-б думак узьлёт.

Ну, дзяўчына і сэрца ў дзяўчыны,
а у сэрцы—палаюць агні
залатога спатканьня хвіліны,
залатыя юнацкія дні.

Сустрэліся! Хто-ж яго знае!
Я ня мог да яе ня прыйсьці.
Можа й дрэнна, што гэтак кахаю,
як нікога ніколі ў жыцьці.

Больш ня будзе—хоць можа й павінна;
Эх, маладасьць, нібы стацьцё,
цёмназорыя вочы дзяўчыны
і мне завязалі жыцьцё.

6. XII. 26 г.

АДГУКНІСЯ

Адгукніся слова слову,
вершам весела зайграй.
Залаціцца
сьвет—зарніцай
каляровая зара.

Адгукніся ліст лісточку
шалясьценьнем вецерка.
У прасторы
ясназорым
я дзяўчынку напаткаў.

Адгукніся сэрца сэрцу
іскрай зорнаю ў глыбі.
Ой, выпадкам
вачаняткі,
як вясьнянкі, палюбіў.

Адгукніся шчасьце шчасьцю
гучнай песьняй хараства.
З ёй пайду я
залатую
сваю будучыну зваць.

ЗАВЯЗКА

Засьвістаў гудок фабрычны;
знача—кідай свой варстат.
— Першы раз, было й нязвычна,
я пайшла ў народны сад.

Вечар быў такі харошы,
як-жа сэрцайка ўстрымаць?
Я ішла... Якой дарожкай?
дый ня ведала сама.

Падышла да рэчкі шустрай.
Месяц хмурыцца ў вадзе.
Да мяне, якраз насустрач,
хлопец ветліва ідзе.

Стаў ля рэчкі, глянуў, глянуў,
усьміхнуўся раз, другі.
Я кідала кветкі ў хвалі,—
расплываліся кругі.

— Як цябе, дзяўчынка, клікаць?
Што-ж саромішся, скажы?
... Я сказала, неяк дзіка—
ён-жа мне зусім чужы.

Раптам страх спавіў дзявочы,
— ці застацца, ці ўцякаць?
Толькі вочы... Вочы... Вочы
сьветлай радасьцю гараць.

Проста дзіўнае спатканьне,
сэрца ў грудзях ня ўстрымаць...
Разыйшліся, як сьвітаньнем
слаўся ў зарасьлях туман.

Зараз кончыцца ў нас праца,
кіну я цябе, варстат.
Пабягу хутчэй спатканца,
пабягу ў народны сад...

1926 г.

ОЙ, НАПЭЎНА, ЗА ВІШНЁВЫМ...

За садочкам, за вішнёвым,
ой, напэўна, за вішнёвым
у сарочцы каляровай,—

там каханы мой чакае,
ой, напэўна, ўжо чакае
і трывожна выглядае.

Як у верасень лісточкі,
ой, напэўна, як лісточкі,
пахмурнелі яго вочкі.

Сэрца мусіць зазлавала,
ой, напэўна, зазлавала,
з-за даліны гнеў пазвала.

Але зараз, праз хвілінку,
ой, напэўна, праз хвілінку
стрэне ён сваю дзяўчынку.

Я-ж ня вінна, ўсё бывае,
ой, напэўна, ўсё бывае
...і ніхто аб тым ня знае

Хочаш так, але сумесьле,
ой, напэўна, ўжо сумесьле,
ўсё ня так, як твае мысьлі.

Але згіне гнеў, даруе,
ой, напэўна, мне даруе—
прыбягу і пацалую...

ЛЕГЕНДА

Стаяў палац... Панурай вежай
глядзеў сурова ў сінь далін.
Наўкола лес сьцяной бязьмежнай
ліў сьлёзы з стромкіх верхавін.

Стаяў палац... Стагналі сёлы,
мястэчкі гнуліся ў бядзе...
Спрадвеку згорблены,
дарогай невясёлай
ішоў за днём нявольны кожны дзень.

У тым палацы, ў сьценах мураваных
жыла Галіна — панская дачка.
Яна таемна, вечарам румяным
хадзіла ў лес пабачыць юнака.

Сьцяпанам зваўся той юнак прыгожы;
з мястэчка быў, ён з нашых сам, каваль.
Сустрэнуцца... На возеры варожаць
і слухаюць жартлівы гоман хваль.

Зьлюбіліся, як зоркі з ночкай цёмнай,
як сонейка з калосьсямі палёў.
... Прышла аднойчы Галя засмучонай,
вочы поўныя гаручых буйных сьлёз.

Жыла агністым шчасьцем кожны вечар
і раптам змушана каханьне пакарыць...
— Волі бацькавай ня можна супярэчыць,—
з другім загадана, з другім мне трэба жыць...

— Як на сьмерць паеду я да шлюбу;
не адну я ўжо сьлязінку праліла.
Даруй мне, мілы мой, даруй, саколік любы,
растацца нам часіна надышла.

Сьцяпан устаў, зьвіліся вочы гневам,
сэрца сьціснулася, моўчкі адышоў.
Думкі носяцца—закінуць шнур на дрэва,
каб навек застыгла ў жылах кроў.

Ночку цэльную ў трывозе, ў задуменьні,—
ў цёмным лесе ноч правёў Сьцяпан.
Помста выклікала сьмелае імкненьне,—
помста горда выпрастала стан!

Галасіла ў роспачы Галіна,
плачам ночаньку за горы правяла,
шкада было Сьцяпана ёй пакінуць,
хоць ня простае крыві яна была.

* * *

Шлюбны дзень... Навезьлі падарункаў
у панскі двор—шырокія вазы.
Баль кіпіць... Зьвіняць кадрылем струны,
льлецца пот з замучаных музык.

Слугі панскія збанамі носяць піва,
дый віна за збанам новы збан...
П‘яны гоман носіцца жахліва
над аголенымі хатамі сялян.

Баль кіпіць... Багатае вясельле!
Шалее паншчына на розныя лады...
Пасьцель пуховую ў пакоі слугі сьцелюць,—
сабраўся йсьці з Галінай малады —

і раптам крык!.. Трывогай задрыжалі
госьці п‘яныя, запенілася кроў,—
Сьцяпан прышоў памсьціць паном за Галю.
Сьцяпан, а з ім грамада дзяцюкоў!

Крывёю сьвіснуў чэрап маладога,
і гаспадар ужо, канаючы, ляжыць.
Галіна скручана халоднаю трывогай:
каханьне й ненавісьць ня могуць разам жыць!

А тут і варта ўзбройна падасьпела;
мячы крывавыя ад сьветачаў блішчаць...
Хвілінаю Галіна анямела,
дый потым стала залівацца-рагатаць...

Сьцяпан пачуў—ня можа больш змагацца,
сілы трацяцца, ў вачох імжыць туман.
Прышла пара з жыцьцём яму расстацца;
ў прадоньне возера з вакна зьляцеў Сьцяпан.

І раптам возера ўздрыгнула, загручэла,
халодным гулам моцна ўдарыў гром!
І стала возера, як жвір акамянелы;
хвалі шумныя застылі курганом...

А няпрытомная Галіна рагатала...
Шалёным віхрам вецер застагнаў...
Зямля затрэслася!.. Разьнёсься гул абвалу,
і зьнік палац—стварылася багна.

. . . .

... Васеньнім вечарам засьвішча ў полі вецер,
застогне лес, рассыплецца імгла...
У мястэчку, ўспомніўшы, расказываюць дзецям:
— Было даўно... Тут быў палац...

1926 г.

ПЕСЬНЯ

І стаіць каліна,
за калінай лозы.
Новай пуцявінай
новыя палозы.

Сосен цёмнасініх
многа ў нашым краі.
Там, дзе багаваньне —
колас вырастае.

Там, дзе шыр балотаў,
вечных лоз драмучых, —
там кіпіць работа
радасьцю гаручай.

Сьцелецца пуцінай,
сьцелецца ня вузкай —
водгульле ў даліны
песень беларускіх.

ДЗЬВІНА

ДЗЬВІНА

I

Добры дзень,
зялёныя загоны-дываны,
я прышоў паслухаць з вамі
гутарку Дзьвіны.

Сакалінай-пераліўнай
прывітала песьняй даль,
плынь бурлівых, цёмна-сініх,
векапомных хваль.

Залаціцца-весяліцца
звонка-струнная вясна.
Добры дзень вам, палачане,
добры дзень, Дзьвіна!

II

Шустры ветрык жартаўліва
у кустох зашалясьціць.
Гоман хваль Дзьвіны бурлівай
чую першы раз ў жыцьці.

Мілагучныя вясьнянкі
ў сэрцы туляцца ў мяне.
Ля ўзьбярэжжа палачанкі
песьняй шлюць паклон вясьне.

Радасьць—іскрамі шугае,
ў полі—кветкамі гарыць.
Хвалі звонкія змываюць
берраг Замкавай гары.

Плыньню плаўнаю, свабоднай
ціха коцяцца чаўны.
Прывітаў я песьняй роднай
Запалоцьце Скарыны.

III

Росная раніца,
сонцам румяніцца,
нібы дзяўчына,
каліна.

Птушкі-вясьнянкі
пяюць спазаранку
ў сасосьніку,
як на гармоніку.

Смутку ня знае
вясна залатая,
ніколі
ў бязьмежным полі.

Хвалі, бывае,
журбу абуджаюць,
нявесела стане,
як глянеш.

IV

Жыцьцю маладому вясной не астыць,
ня спыніць яго песьні стазвоннай.
Чарадою плывуць па Дзьвіне плыты,
мінаючы горы, лясы, балаты,
пад сьпеў маладых плытагонаў.

Забаўна плывуць за плытамі чаўны,
хістаюцца ў золаце хваляў.
Любыя песьні гульлівай Дзьвіны,
у сонечнай радасьці звонкай вясны
чаму спавілі мяне жалем?

Жудасна. Крыўдна. Яшчэ вярста,
і гоман прывольля зьнікае.
Сьлёзы нядолі там лье бедната,
пазбаўлена ў роднае хаце кута—
мовы роднае іх пазбаўляюць.

Сьцюдзёным туманам на сэрцы іржа
балюча атручвае радасьць.
Дротам калючым сьціскае мяжа,—
а за мяжой кайданы бразжаць,
кучаравыя сохнуць прысады...

V

Вечарам ясна-вясеньнім
люблю рассыпаць лятуценьні.
Хочацца ціха, пакорна
туліцца да ночанькі зорнай,
забыцца аб дзеннай завеі
хвілінкай маленькай аднэю...

Хочацца думкамі ўзьвіцца
над вольнаю ў сьвеце зямліцай!

Люблю прытуліць лятуценьні,
дый... цені, праклятыя цені
Беларусі спраўлялі хаўтуры
сваёю гвалтоўнай „культурай“.
Беларусь не па сэрцу, скрыгочуць,
засланілі-бы, гады, ёй вочы.

О, цені, прыблудныя цені
носіць імглістая цемень.

VI

Сказ пра Дзьвіну нам раскажа парою
лірнік, схіліўшысь пакорна журбе:
„Бераг твой срэбны, дно залатое,
кроў працякала, Дзьвіна, праз цябе.

Шляхта, ксяндзы, ізуіты зьвярына
глумілі бязьвінных тутэйшых людзей.
Набегам няволілі нашу краіну
хэўра разьюшаных рускіх князей.

Дый палачанкі княжны Ефрасініі
сёньня стаіць не адзін манастыр,
хоць змоўклі-заціхлі у зарасьлях ціны
шумныя хвалі сівой Палаты.

Там, дзе радзіўся Францішак Скарына,
чакалі стагодзьдзямі сонечны дзень.
Раней ізуіты глумілі бясчынна
і пакаленьне праклятых князей“.

VII

Неяк думкі ўзьвіюцца варожа,
глянь адно,—за царквою царква.
Гэтым скарбам падужацца зможа
з перамогаю толькі Масква.

Пасінеўшы стаяць камяніцы;
бывала, пад бразганьне шпор
кадзеты хадзілі маліцца
ў праславуты Сафійскі сабор.

І многа, ой, многа было іх:
аплялі, як на пасецы мох.
Але ўсё-ткі народ наш устоіў,
захаваўшы хоць мову ў грудзёх!

Сёньня новымі ўзорамі звычаі
сталі наша жыцьцё аздабляць.
А чынушы „былого величия"
хоць за... ногі гатовы кусаць.

VIII

На вуліцах сьціхне ўвечары гоман,—
„былое величие“ ў пролазах цьмы
песьню заводзіць пад хрып грамафона:
— „бывали дни—гуляли мы“.

Зьбяруцца суседзі зблізку, здалёку
паслухаць „восточный цыганский романс“,
вып‘юць па чарцы вішнёўкі салодкай,
пульку сыграюць адну ў профэранс...

Вістуюць усе... Азарт забірае...
Бяз козыра... Ў цёмную... Бубні-звон.
Жанкі падкіднога сабе падкідаюць,
хрыпіць, пацяшаючы іх, грамафон.

Анекдот?—бясспрэчна! Жарт?—бязумоўна!
Сьмех?—ён-жа радасьць пары залатой.
...На вока папаў „Беларускі слоўнік“,
застыгла вясёласьць, зьмяніўся настрой.

IX

Скубуць намі ўзьнятае роднае слова,
расьцьвіўшае пышна, як сонца, як дзень.
Слову служылі грудзі аховай, —
ня вытруціць вольна ўздыхнуўшых грудзей!

О, пакаленьне, — „пшаніца хрыстова“,
было узьнялося, як вецер з-за гор.
Стрыножыць імкнуліся роднае слова,
што вызваліў Наш Семнаццаты Год.

Ніколі ня сьцяць ім жыцьця маладога,
не зацямніць нашых сонечных дзён.
Няхай-бы гулялі сабе ў падкіднога
дый соладка слухалі-б свой грамафон.

О, спадчына лютая! Хто-бы забраў-бы?
(Жыцьцё не да смаку бяз розных прыкрас).
З пасагам аддалі-б, з прыбыткам, запраўды,
адно, каб ня стала іх толькі у нас.

X

Шэлест гульлівы, шэлест вясеньні
ветрыкам носіць мае лятуценьні.

Звонкае поле. Зялёныя сьцежкі
сэрца ўзбудзілі квяцістай усьмешкай.

Знаю я, знаю, рассыплецца цемень,
зьнікнуць-загінуць прыблудныя цені.

Вораг, як хваля у сьнежні, застыне.
Эх, залатое Наддзьвіньне!

Полацак, 1926 г.

...Родину и матерей
никто и никогда не забывает...

И. Уткин

„ДВАЦЦАЦЬ"

З поэмы майго жыцьця

Маці маёй
прысьвячаю.

МАЦІ РАСКАЗАЛА...

1

Маці мая! Матуля мая!
Мінулае гора ў тваёй сівізьне...
Я, схіліўшыся ў думках,
пакорна стаяў;
за вокнамі слаўся сьнег.

Слаўся сьняжынкамі,
слаўся над краем,
слаўся, ўзбудзіўшы ўспаміны стацьцём...
Маці, матуля мая дарагая,
мне расказала
пра наша жыцьцё:

— Студзень. Шосты год.
Дваццатае сталецьце.
Водзе ў карагод
голад свае сеці.

Холадна. Мароз.
Узор на вокнах віўся.
Добра-б толькі рос,—
ты, сынок, радзіўся...

2

Помню той вечар,
вецер ня выў.
Шукалі за печчу
сьвятое травы...

Малілася хата,—
ў пашане Спас...
— Будзе багаты,
ў шчасьлівы час!..

Больлю затросься
бацькавы твар,—
цяжка жылося,
мацнеў цяжар.

Высахлі грудзі,
хата, як склеп...
Добрыя людзі
прынесьлі на хлеб.

3

І ў гэты вечар
і вецер ня выў,
і сьнег карцеччу
у вочы ня біў.

У горадзе звонка,
вітрыны, агні;
гудуць беспрасонку
і ночы і дні.

Са сьвістам ізвозчык
імчыцца з гары.
Вярбуюць на плошчы
кіно-ліхтары.

Аркестра склікае
ў кафэ-рэсторан.
Тракцір забаўляе
песьняй цыган.

4

І ў гэты вечар
і вецер ня выў...
Меў вочы, як сьвечы,
гарадавы.

Глуха ў завулках,—
беднота, гальлё.
Лахмцьце прытулак
падпольлю дало.

Ні хлеба, ні сала,
галодная сьмерць.
Рабочы ў падвалах
выкоўвае сьмерч.

І рвецца з падпольля:
„Далоў царскі стан!“
Ня будзе Менск болей
кафэ-шантан.

5

Вясна прыляцела з надзеяй—
можа ўдасца работу знайсьці.
Але, дзе заработак, дзе ён,
да каго і куды ісьці?

Ї нявесела ў згорбленай хаце,
грудзі точыць бяда, як іржа,
хто-ж за горкія сьлёзы заплаціць?
Камень сьмерці на сэрцы ляжаў!

Бацька ў тракціры з сябрамі
прапівае сваё паліто.
Бывае, сваімі рукамі
задушыць быў цябе гатоў.

Цярпелі нядолевы кпіны,
жылі кропляю бруднай расы.
Дачакалі вальнейшай хвіліны
сівыя мае валасы.

6

Заўсёды клумкі клопатаў,
сьлёзы, бой, грызьня...
Жыцьцё няслося з грохатам,
як пыл ды з-пад каня.

Вадой!.. І сталі-б сьвежымі
і вуліцы і шлях.
Жыцьцё такое-б—зьвежаў мы,—
ўгнаілася-б зямля.

Але сьціскала гора нас,—
тупой сякеры сталь.
І так жыцьцём заморана
гібела бедната.

Але за што? За што гэта
адны ў сухотах мруць,
другія сытным рогатам
дукаты ў банк кладуць?

7

Задуменны, нібы вучоны,
на вуліцы бацька блукае.
А на рынку тракцір разгонны
разгулам яго заклікае.

Не працуе, працы—нічога,
дзе мага яго вочы лезуць.
Раз п'яны страсануў гарадавога,
трасануў, пяючы марсэльезу.

Гаварылі яшчэ, што азартам
аб калена зламаў „селядзец“.
Прыляцела суседняя варта...
Так вісела бяда на бядзе.

Судзілі... Сядзеў... Выйшаў...
А ў сэрцы кіпіць непагода...
Кароткія-ж ніткі зацішша
ўвосені шостага году.

8

Гора з бядою халоднай навалай
грудзі сьціскалі, як змрочныя дні.
Ой-жа ня лёгка жыцьцё каратала,
сьлёзы сушыла ня раз на агні.

Ня мала бялізны сьцірала па людзям,
вечна на пальцах былі вадыры.
Сілы губляла, атручвала грудзі
флёркай, крахмалам... дый што гаварыць!

Помню, стаяла праклятая восень...
Хто-ж гэта знае, дзе стрэнеш бяду...
Табе ўжо сабралася месяцаў восем;
вецер няшчасьцем над намі падуў.

Бацька, як вып'е,—вар'ятам рабіўся,
і так вось п'яныя ў загрудкі ўзяліся.
Ведама, тут і нажы ў іх з сабой...
Бацькі ня стала. Заліўся крывёй...

9

Ворагу толькі і болей нікому
долі такой не жадаю.
Бегчы часамі хацелася з дому...
Як пражыла? Ня знаю...

Кідацца мне давялося ня мала,—
да цёмнага змроку ад раньніх зарніц.
Я ўжо казала, халоднай навалай
грудзі слабелі, як сталь на агні.

Дзе-ж я магла хоць падумаць часамі,
што ўсё-ткі сапраўды лягчэй зажыву.
Ведала толькі: на сэрцы камень,
ведала толькі: палын-траву.

Ой-жа, з мінулым ня лёгка расстацца,
ой-жа, ня лёгка вось так расказаць...
Дваццаць гадкоў праляцела... Дваццаць...
. . . .
Матчыны скроні прамыла сьляза.

ГАДЫ ДЗІЦЯЧЫЯ

10

На Пярэсьпе[1]) нарачыта
сабіралася дзятва.
І ня раз і ня два
мне была мая разьбіта
за лаптою галава.

На магілках Старажоўскіх[2])
праз крыжы і курганы
лазіў я па каштаны
і кожны раз і неяк лоўка
рваў картовыя штаны.

Галубоў ганяў са сьвістам...
Часта—выстраімся ў рад
і цішком, праз плот, у сад,
здымем яблыкі на чыста
і за грыўню Шлёму ў—склад.

---

[1]) Прадмесьце Менску.
[2]) Могільнік на Пярэсьпе.

І гулялі кожны вечар
у „вайну“ супроць паноў.
І вакно і не адно
ў гэты вечар пакалечым.
Ну, а заўтра?—заўтра зноў...

11

Прывучаць мяне сталі да працы,
за шавецкі ўсадзілі варстат.
Стаў я корчыцца, клеіць абсацы,
шнураваць памаленечку стаў.

Незадоўга паслалі вучыцца,—
купіў з пераплётам „букварь"—
стала „молнией" мне бліскавіца
і „хозяином" стаў гаспадар...

Вяселей і на сэрцы ў матулі,—
як-ні-як, не байдосуе больш.
Харашэй прыадзелі, абулі,
і ў кішэні зароблены грош.

Меў яшчэ і другі заработак,
быў прыслужнік царквы, панамар...
З папіросай, у лакавых ботах
па нядзелям хадзіў на бульвар

і валондаўся цэлымі днямі;
слухаў сьпевы катрынкі заўжды.
І разглядваў сабе ў панараме
за капейку—усе гарады.

З тэй пары, як відаць, палюбіў я
родных вуліц і гоман і крык...
Эх, зялёныя дні, дарагія
бястурботнай дзіцячай пары.

12

Былі часы, разносіў вецер іскры!
Матуля добрая,
успомні тыя дні.
І ўноч і ўдзень
прыносіў нам вятрыска
і страх, і дым,
і голад,
і агні...

Я помню:
раніца ліпнёвая стаяла,
разрываліся
гарматы, нібы гром.
А ў горадзе
шалёнаю навалай
разносіў плач
разьюшаны пагром.

Як расы зарою на байдане,
так на бруку выбітага шкла.
Крамы ўзломаны
ваякамі Пазнані;
сіла чорная па гораду прайшла.

Раптам—
крык, гарматы,
блізка, блізка...
З пагрому я ляцеў—
завулкамі, грунём.
Пад пахай скрыначка
патоптаных ірысак,
а за пазухай—
дзьве пары панталон...

Маці бедная,
старэнькая матуля,
перахрысьцілася,
ўзяла з камоды хлеб;
а ў сьцены стукалі
сьвінцом гарачым кулі...
Мы паціханьку
паўзьлі
хавацца ў склеп...

Мінула ноч...
Замоўклі кулямёты...
Над пажарышчамі
віўся дымны чад.
З склепу вылезьлі,
на плошчу зноў я зьлётаў:
— Прышлі Чырвоныя!
Чырвоныя!
...Парад!

13

Холадна. Застыў
шумлівых вуліц гул.
Бягу ў „каператыў“
раней заняць чаргу.

Поўна галава
радасьці, надзей,—
будуць выдаваць
воблу і алей...

* * *

Вогнішча расклалі.
Холадна. Мароз.
Рана паўставалі.
Выцягнуўся „хвост“.

Многа нараканьняў,
дзе ні закрані:
— Трэба чвэрць, а глянеш,—
толькі залатнік.

Дзе там пералічыш,
абіраюць голь:
выдаюць сярнічкі,
а хаваюць соль...

* * *

Пішуць для парадку,
крэйдай, як па норме,—
на грудзях, на латках,
кожнаму свой номер.

І ў мяне дзесяты,
а прышоў другім.
Хочацца да хаты—
сьцеражэш чаргі...

* * *

Сонца разбудзіла
прозалаць-зара.
І мяне зьмяніла
замярзаць сястра.

ДНІ ЮНАЦКІЯ

14

Вей-вецер з поўначы прынёс і раскідаў
завею сьнежную, акутваючы горад...
У вёску дальнюю (гарэлі ў небе зоры)
пайшла нас моладзі рабочай грамада.

Прысады ўбраныя ў сярэбраны паркаль...
Дарога доўгая... Застыўшыя відалі.
Стагналі правады халодным гулам сталі,
ільдом пакрылася гульлівая рака.

За вёрст семнаццаць мы, а можа і далей,
ішлі ў абмен пуцінай сьнежна-сіняй
і несьлі—хто цьвікі, хто хустку, хто гадзіньнік,
і ўсе авеяны пяшчотамі надзей.

Мінаем хаты мы... Палёў гаспадары
прымаюць нас далёка не гасьцінна:
даюць нам для пацехі бульбы поўасьміны,—
а мароз узводзіць белыя муры.

І крыўда і мароз у сэрцы струны рвуць;
такое першае маё азнаямленьне:
ішоў у вёску я—віліся лятуценьні,
ішоў дамоў—схіліўшы галаву.

15

Сонца адно у ваконца вакно
пастукае, нехаця скажа:
— Настала жыцьцё,
сваё лахмацьцё
вязі—
па гразі,
— распрадажа!

Галодны час... Старасьвецкі абраз
для глянсу алеем абмажуць.
— Мацьтваю так!
Самога Хрыста
нясі—
галасі,
— распрадажа!

Шаўцы-бедната паходны варстат
паставяць, начыньне разьвяжуць.
— Да вечару й што-ж,
без работы нож
і зноў—
адно,
— распрадажа!

Вясёлы заўжды карчмар малады
сёньня нявесела кажа:
— Цяжка цяпер,
трэба цярпець;
вязу—
каву,
— распрадажа!

Так тваю маць!.. Дзе-ж хлеба дастаць?
Трупам на вуліцы ляжаш!
Ой, галыцьбе
дык самога сябе,
сябе,—
за рубель,
— рас-пра-дажа!

16

Інакшыя дні, інакшыя словы
вясёлкавым зьяньнем зьвіваюць жыцьцё...
Сьцеляцца думкі сузорнай падковай,
пахаладзеўшае гіне стацьцё.

Пазвала жыцьцё за напружную працу,
бо ў спадчыну нам ад прышэльцаў былых—
на фабрыках нашых разьбітае, братцы,
разьбітае ўсё—варстаты, катлы,

і сьцены ўзарваны, і толькі руіны
раскінуты цэглай і як-жа тут быць?
Пазвала жыцьцё адбудоўваць краіну
пасьля перамогі, пасьля барацьбы.

Вось тут, вось цяпер як трэба пазнаў я,
што ворагі мы і паном і цару.
І тут толькі ўбачыў, што доля ліхая
вякамі акручвала край Беларусь.

Нязнанае мне прад вачыма паўстала,—
любіў я, расхлыснуўшы грудзі наўсьцяж,
чытаць-пералістваць Янку Купалу—
ўзьвівалася моладасьць „Шляхам Жыцьця"

Вышылі мне ў васілёчкі кашулю,
стаў я ў рэдакцыях частым гасьцём.
Там кучаравага ўбачыў Бядулю,
сядзеў ён за большым, як сам, сталом.

А далей і болей... Сьвядома, выпадкам—
стаў чытачом беларускіх газэт.
І палюбіў „Беларускую Хатку"—
мне праясьняўся няведамы сьвет.

Ў завулку Пярэспы, ў завулку зялёным
(быў вечар авіты красой пазалот...)
стаў мне выпадкам, здаецца, знаёмы—
мяцежны Кудзелька, шумлівы Чарот...

Імчаліся дні! Ніхто іх ня зловіць!
Няма ім падобных, хоць крышку, цяпер.
Газэты расклеены... Александровіч,—
з другое старонкі падміргіваў верш...

О, колькі запалу ў нязнаным уздыме!
Рыфмы зьвівае мая галава!..
У шэрым завулку... Дубоўка Ўладзімер
спаткаў мяне... Помню—была Масква.

Там... за Масквой...—Узьбярэжжа мора...
Грудзі сьціскаліся... Кашаль душыў...
. . . .
Блізкімі сталі мне нашы прасторы,
і з імі жыць буду, як дваццаць пражыў.

17

І гады мінулі, ой, гады цяжкія,
дый прышлі дзянёчкі, толькі ўжо другія.

І дзянёчкі сьцелюцца новай пуцявінай,
дый гукае моладасьць родная краіна.

І зьбірала-звала гулам віратлівым
дый мяне пазвала, знача я шчасьлівы!

І забудзем гора, што было заўчора,
дый збудуем горад, пролетарскі горад.

І зазвоняць фабрыкі, і ўзрасьце над краем
дый крылатай гордасьцю доля залатая.

І гады мінулі—не вярнуць ніколі!
Стаў я ўжо інакшым, стаў я комсамолец...

18

Сёньня дваццаць мне...
Яшчэ ня мала жыць!
Відаць, прыходзіцца
адкінуць лятуценьні.
Калісьці йшоў я
з сонцам на нажы,
любіў часамі крышку бурапеніць

(і выпіць чарачку...
Была такая справа).
Ляцела зоранька мая за небасхіл.
І сонца ветлы сьвет
і сонца сьвет яскравы
зацямнялі чорныя грахі.

І не адзін я быў,
з таварышамі разам,
з таварышамі, дружнай грамадой
байдосавалі сілу і ні разу
пачалавечаму ня выйшлі мы з піўной...

Але выпадкам,
дзівішся ў надзвычай,

выпадкам вынырнуў
з атручаных богем.
І новае жыцьцё
стварыла новы звычай,
а ён прынёс
бязмежжа новых зьмен.

Пазнаў жыцьцё
праз цемень дзён разгулу;
як страшна ўспомніць
хмельна-п'яны год!
Але мінулае
застыла-патанула
ў цёмна-сіняй зарасьлі балот.

Цяпер мой шлях
нікому ня стрыножыць,
здабыты ён у дні агнёвых бур.
Ніхто мяне ніколі ўжо ня зможа—
хай сёньня
Беларусь,
а заўтра—
Аранбург!

19

Вось часамі ўвечары, ў даўгія вечары,
аб мінулым хочацца думаць, гаварыць.

Сьцежкі палыновыя замучанай зямлі
кветкамі вясьнянымі зайгралі-зацьвілі.

Сёньня ня сустрэну я ні сьлёзаў, ні журбы,—
—радасьць сонцам сьцелецца, шчасьце барацьбы.

Звонам разьліваецца, гоманам крыніц
залатая будучына—бронзавыя дні.

Вось часамі ўвечары, у змрочнай сіняве,
думанькі крыляцца ў замураваны сьвет.

* * *

Казалі многа нам і рознае заўсёды,
ў каго і чым набіта галава:
Ці-ж вы народ, вось як і ўсе народы,
падобна нацыі з культураю прыгоднай?
Ї што ў вас ёсьць,—адвечная дрыгва?

Казалі многа нам і... несьлі нам нямала,
бяда за бедамі імчалася угрунь.

Глумілі нас, накінуўшыся шквалам,—
За што? Хіба за тое, што, як кажуць, нас злучала
адно—нацыянальнае—калтун?

За тое, што выносьлівых і цёмных
і многа так патрэбных дужых сіл!..
Душылі змораных, скрываўленых, палонных,
за працай чорнаю, на панскіх на загонах—
іх сьлед раскінуты мільёнамі магіл.

Казалі многа нам... Ці-ж ветры не навеюць?—
Мужык і хам, і гад, і галыцьба.
І чым ня лаялі прыблудныя зладзеі
краіну, дзе спрадвек пакутнасьці завеі,
дзе ня ўгледзіш чалавека без гарба.

Казалі нам... А мы ў адказ ня многа...
Паўстаў прыгнечаны працоўнай стараны!
Жыцьцё зьмянілася! Ня будзе больш вастрогам!
Вякі над кручаю! Сьвяткуем перамогу!
Заплакалі разьбітыя званы!..

Пайшоў і я дарогай камяністай,
пайшоў з рабочымі пад сьвіст ліхіх віхур.
Пайшоў бадзёры я, з прыпеўнасьцю агністай!
І сёньня разам я з грамадай комуністых
за цэглай цэгліну ўскладаю ў новы мур...

* * *

Сьцежкі палыновыя замучанай зямлі
кветкамі вясьнянымі зайгралі-зацьвілі.

Сёньня ня сустрэну я ні сьлёзаў, ні журбы,--
радасьць сонцам сьцелецца, шчасьце барацьбы.

Буйнымі калосьсямі зацьвіла дрыгва,—
Беларусь працоўная—краіна харастваl

Звонам разьліваецца, гоманам крыніц—
Залатая Будучына—бронзавыя дні!

20

Сонца спаліла асьнежны сумёт...
— Дваццаць першая йдзе вясна!
Эх, любая моладасьць! Дваццаць год!
— Вып'ем, таварыш, да дна!

Дваццаць першая йдзе вясна—
не адна зазвоніць струна,
абуджу ў сэрцы тысячы струн
ў бязьмежны ў сусьвет угрунь.
Рукі ўгору, а грудзі наўсьцяж,
я—схапіўся за крыльлі жыцьця.
Пазнаў я і радасьць і ўздым
ў сьвеце новым, інакшым, другім...

Дваццаць першая йдзе вясна—
не адна зазвоніць струна!..

Менск. XII—1926.

ПЕРАД БУДУЧЫНАЙ

БУДЗЕ ВАЙНА-ЗАВІРУХА

Раньняй зарою прасочыцца дым
над сінімі хвалямі мора.
Зноў пазалотаю сонечнай Крым
на скалах раскідвае ўзоры.

Неяк выпадкам
цыганку спаткаў.
Чорная.
Стан прыгожы.
Глянула ласкава.
Карты ў руках.
— Быць ці ня быць?
— Паваражым!

Карты тасуе...
        — Эх, мой браток,—
расказвае зьдзіўлена, глуха.
— Туз-арыштант табе стаў папярок,—
будзе вайна-завіруха.

— Вось каралі, і адзін і другі,
сьцяць нас імкнуцца атрутай.
Хочуць стрыножыць, надзець ланцугі,
але давядзецца ім крута!

— Бачыш?

Валетаў чырвоных атрад
ладзіць абоймы, патроны.
І ўжо гатовы адказам на чад
выпусьціць свой, чырвоны!

Бегам шалёным імчацца гады...
Слухай, што скажа цыганка:
Хай нашы ўсе, як адзін, гарады
адказваюць танкам на танкі.

Карта нядобрая, ўсе як адна:
кроў і атрута й магілы.
Скора ўжо, скора надыйдзе вайна,—
бойня нязнанае сілы.

Глянь!
Апошняя карта лягла,
чырвонае масьці!
Наша!

Усё расказала. Усё, што змагла.
На варце!
Будзь сьмелым!
Ня страшна!

. . . .

Па-над каменнай чалмою скалы
глыбока ў блакіце сьцярожаць,
сьцярожаць падужацца два арлы,—
хто-ж і каго пераможа?

ПЕРАД БУДУЧЫНАЙ

Ішлі гады. На хвалях мора шквалам
схіляў наш парус раззлаваны шторм.
За валам вал ляцеў на нашы скалы—
разьбіты кідаўся ў падножжа цёмных гор.

А вецер гнаў за валам вал навалай,
схіляў наш парус раззлаваны шторм.

Ідуць гады. І бліжай, з хваляў мора,
агні віднеюцца далёкіх берагоў.
У зьяньні тым, у залатым сузор'і
ўзрастае будучына, радасьць новых слоў.

Зямля вялікая! Вялікія прасторы—
агні віднеюцца далёкіх берагоў!

ЗЬМЕСТ

Стар.

ВІРАТЛІВЫ РАЗЬБЕГ

МОЛАДАСЬЦЬ І СОНЦА

„ДВАЦЦАЦЬ“, з поэмы майго жыцьця:

ПЕРАД БУДУЧЫНАЙ